№ 17

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ

Я—СЫН ТРУДАВОГА НАРОДА

(Песня маладых байцоў)

Я—сын трудавога народа—
Пад сцягам чырвоным стаю,
Вінтоўку бяру баявую
І клятву Радзіме даю:

Клянуся, што буду я варты
Высокага звання байца,
Клянуся за шчасце радзімы
На варце стаяць да канца!

Краіны не знойдзеш на свеце,
Дзе людзям так хораша жыць,
Няма ганаровай больш справы,
Чым у Арміі нашай служыць.

Нас любіць Радзіма ўся наша,
Мы—гордасць краіны свае,
Мы знаем, за што нам змагацца,
Нам сілы наш Сталін дае.

Усё наша ўменне і веды
Мы Арміі нашай дамо,
Мы вывучым тэхніку боя,
Пазнаем шляхі перамог.

На сушы, на моры і ў небе
Мы ворага знішчым, сатром,
Геройству вучыцца мы будзем
У далёкаўсходніх палкоў.

Наперад, байцы маладыя,
Сыноў баявая сям'я!
Няхай нашу звонкую песню
Пачуе Советаў зямля:

Я—сын трудавога народа,
І клятву радзіме даю,—
Выдатнікам буду ў вучобе
І буду героем ў баю.

Вас. Лебедзеў-Кумач.

РАБОТНІЦА І КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ. ВЫДАННЕ ЦК КП(б)Б. № 17. ВЕРАСЕНЬ 1938 г.

На вокладцы: Шарко Ольга Канстантынаўна—стаханаўка-камбайнерка Самахвалавіцкай МТС, член прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР.

СЛАЎНАЯ ГАДАВІНА

Тры гады назад—30 жніўня 1935 года данецкі забойшчык шахты „Центральное Ирмино“ Аляксей Стаханаў устанавіў небывалы рэкорд. Ён дабыў за змену 102 тоны вугалю пры норме 7 тон.

Слаўны подвіг данецкага забойшчыка прагучэў на ўвесь свет. З гэтага часу пачаўся вялікі стаханаўскі рух, які стаў магутным водгукам народа на заклік таварыша Сталіна аб аўладанні тэхнікай. Перадавікі рабочага класа паказалі выдатныя ўзоры комуністычнай працы і іх прыкладу паследвалі мільёны людзей. Разгарнуўся новы, вышэйшы этап соцыялістычнага спаборніцтва.

Стаханаўскі рух зламаў і прадаўжае ламаць адну тэхнічную норму за другой. Ён паказвае, што совецкія людзі, авалодаўшыя тэхнікай, могуць тварыць цуды.

За тры гады свайго існавання стаханаўскі рух разросся ўглыб і ўшыр, ён ахапіў рабочых усіх галін прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Сотні цудоўных імён, такія, як Вінаградава, Дземчанка, Крыванос, Мазай, Дзюканаў, Ангеліна, Гудаў і іншыя, вядомы кожнаму працоўнаму. Гэтыя людзі ператварыліся ў народных герояў. І спіс гэтых герояў з кожным днём расце. Не так даўно краіна з пачуццём найвялікшай радасці і гонару чытала ўказ Вярхоўнага Совета СССР аб узнагародзе за выключныя ўзоры работы грузчыка Днепрапятроўскага порта тав. Блідмана.

Пачэснае месца ў гэтым цудоўным спіску займаюць жанчыны. Хто не ведае Еўдакію і Марыю Вінаградавых, Пашу Ангеліну, Пашу Ковардак, Марыю Дземчанка,—гэта слаўныя дочкі совецкага народа, гарачыя патрыёткі радзімы, якія на справе паказалі сваю адданасць справе партыі Леніна—Сталіна. Сталінская Канстытуцыя дала совецкай жанчыне аграмадныя правы і магчымасці, і яны на справе паказваюць, на што здольны жанчыны свабоднай і шчаслівай краіны.

Ворагі народа трацкісцка-бухарынскія бандыты, подлыя здраднікі нашай радзімы, бачачы вялікую сілу стаханаўскага руху, усялякімі гнуснымі сродкамі імкнуліся сарваць яго. Але яны пралічыліся! Слаўная совецкая разведка пад кіраўніцтвам сталінскага Наркома таварыша Ежова разграміла іх і стварыла ўмовы для яшчэ больш магутнага ўздыму стаханаўскага руху.

Наша ордэнаносная Беларуская Рэспубліка таксама мае чым ганарыцца. На кожным прадпрыемстве, у кожным калгасе ёсць дзесяткі людзей, авалодаўшых майстэрствам стаханаўскіх метадаў працы. І сярод іх зноў-такі пачэснае месца займаюць жанчыны.

Кожны дзень з прадпрыемстваў і соцыялістычных палёў паступаюць весткі аб новых поспехах у рабоце стаханаўскіх брыгад, звенняў камбайнерак, трактарыстак, ільнаводаў.

Так, выключныя поспехі ў рабоце паказвае скразная брыгада комсамолкі Падскачэвай на Віцебскай панчошнай фабрыцы імя КІМ. Стаханаўкі мэблевай фабрыкі імя Халтурына ў Бабруйску тт. Міхно і Шпаткоўская выконваюць норму на 300 проц. Лакіроўшчыца Менскай галантарэйнай фабрыкі імя Фрунзе тав. Сыпнеўская выконвае норму на 260 проц. Маладая стаханаўка-рэвальвершчыца Менскага завода ланцугоў „Галя“ Ніна Мацюшэвіч выконвае дзенную норму да 230 проц. Работніцы Менскай швейнай фабрыкі імя 8 Сакавіка тт. Ловач, Галімсон, Куніцкая і інш. сістэматычна даюць 235 проц. дзеннай нормы. Знатная камбайнерка Заслаўскай МТС—ордэнаносец Кацярына Мандрукевіч убірае да 13 га ў дзень пры норме 4 га.

Яны не адзінкі. Такіх людзей у нас тысячы.

Рэкорды паасобных людзей зараз ужо недастатковы. Гэты год выдатны тым, што стаханаўскі рух становіцца ўсё больш і больш масавым. Ёсць ужо сотні і тысячы стаханаўскіх брыгад, дзесяткі і сотні стаханаўскіх змен. Выраслі выдатныя стаханаўцы-камандзіры вытворчасці, якія ўмеюць па стаханаўску арганізаваць работу цэлых калектываў.

Поспехі ў нас велізарныя. Але гаворачы аб поспехах, нельга не сказаць аб тым, што ў нас у Беларусі яшчэ далёка не ўсё зроблена для разгортвання сапраўды масавага стаханаўскага руху, для суцэльнага ахвату работніц і калгасніц гэтым выдатным рухам.

У нас яшчэ вельмі слаба ліквідуюцца вынікі шкодніцтва на гэтым участку. Кіраўнікі вытворчасці не выконваюць патрабавання партыі аб большэвіцкім узначальванні стаханаўскага руху.

Адным з буйнейшых недахопаў у рабоце гаспадарнікаў, партыйных і профсаюзных арганізацый, які затрымлівае рост радоў стаханаўцаў,—гэта тое, што паасобныя арганізацыі недаацэньваюць ударніцтва, лічачы яго ўжо аджыўшым. Гэта проста шкодная справа, і трэба з такім з'явішчам змагацца. Ударнікі з'яўляюцца асноўнай масай, з якой вырастаюць стаханаўцы, і ігнараваць іх ні ў якім разе нельга.

На радзе прадпрыемстваў няма належнай дапамогі стаханаўцам. Часта прапановы, просьбы стаханаўцаў не выконваюцца. Між тым выкананне іх не складае ніякіх цяжкасцей, а ўмовы працы стаханаўца маглі-б значна палепшыцца. Так, стаханаўка Сыпнеўская (галантарэйная фабрыка імя Фрунзе) на працягу амаль двух год просіць цэхавую адміністрацыю і дырэкцыю фабрыкі зрабіць высокае крэсла, каб ёй зручней было працаваць. Усе згаджаюцца, што гэта сапраўды патрэбна, але і да гэтага часу крэсла яшчэ не зроблена. Стаханаўкі завода ланцугоў „Галя“ вымушаны самі падносіць да станка дэталі, і толькі, калі на заводзе пачынаецца „штурм“, ім арганізуюць падноску ўсяго неабходнага да рабочага месца.

Чацверты год стаханаўскага руху павінен быць годам суцэльнай стаханаўскай работы цэлых прадпрыемстваў, калгасаў, соўгасаў, і жанчыны ў гэтай важнейшай справе, як і заўсёды, павінны заняць адно з першых месц. Гэта забяспечыць новыя перамогі соцыялізма ў нашай краіне і яшчэ больш умацуе яе абароназдольнасць, яе моц.

СТАХАНАЎСКАЯ БРЫГАДА

Калектыў рабочых Менскай друкарні імя Сталіна зараз работае над выкананнем адказнага задання партыі і ўрада—выпускам стабільных падручнікаў. Наша брыгада работніц сшывальных машын прыкладвае ўсе свае намаганні, каб з гонарам выканаць гэта важнейшае заданне.

У брыгадзе ў нас 40 чалавек. Складаецца яна амаль выключна з жанчын. Многія нядаўна прышлі ў друкарню, але я з гонарам магу сказаць, што маладыя і старыя работніцы паказваюць выдатныя ўзоры работы. Гэта пацвярджаецца фактам, што брыгада наша цалкам стаханаўская. З месяца ў месяц перавыконваем вытворчыя заданні.

Аб рабоце некаторых стахановак я хачу расказаць. Тав. Лунгіна ў друкарні работае з 1919 года. Яна значна перавыконвае нормы. Два гады таму назад унесла рацыяналізатарскую прапанову, якая намнога павялічыла вытворчасць працы на сшывальных машынах. Лунгіна перадае мэтад сваёй работы ўсім работніцам брыгады.

Шнейдэр Хава—таксама старая работніца. Не гледзячы на тое, што яна інвалід другой групы, норму заўсёды перавыконвае. У тав. Шнейдэр высокая якасць прадукцыі.

Стаханаўкі—Каралёва, Бейнінсон, Стронгіна, Ганчарова, Эпштэйн таксама паказваюць добрыя ўзоры ў рабоце. Яны вывучылі машыну, авалодалі тэхнікай сваёй справы.

Тав. Левіна—маладая работніца. Добрасумленна адносіцца да работы, сістэматычна перавыконвае план. Пры норме ў 2.470 кніг, яна сшывае 3.500.

Стаханаўская работа намнога падняла заработак работніц. Калі ў мінулым годзе ў сярэднім работніцы выпрацоўвалі па 6 рублёў у дзень, то зараз яны зарабляюць па 9-10 рублёў у дзень. Паміж асобнымі работніцамі ў нас заключаны соцдагаворы. Так, тав. Каралёва спаборнічае з Бейнінсон і Майсейчык, тав. Стронгіна з Ганчаровай і т. д.

Зводкі выканання аператыўных заданняў у нас вывешваюцца на відным месцы. Кожная работніца штодзенна ведае, колькі яна выпрацавала і колькі зарабіла.

У брыгадзе выпускаецца насценгазета. Работніцы прымаюць у ёй актыўны ўдзел. Ёсць у нас і свая фота-газета. Усе члены брыгады—члены Асоавіяхіма.

Некалькі слоў аб перашкодах у рабоце. Мы асабліва адчуваем дрэнную работу Менскай электрастанцыі. Часта бываюць прастоі з-за адсутнасці току. Вялікі тормаз у рабоце і тое, што, брыгада не забяспечана падсобнай рабочай сілай. Адміністрацыі друкарні і пераплётнага цэха трэба як след узяцца за ліквідацыю гэтых недахопаў.

Я, як брыгадзір, абяцаю прыкласці ўсе сілы, каб у далейшым брыгада работала яшчэ лепш.

Бродкіна П. А.
брыгадзір пераплётнага цэха



Стаханаўка Лунгіна перадае вопыт сваёй работы маладым стаханаўкам Бейнінсон і Стронгінай.

На дэманстрацыі моладзі г. Менска, прысвечанай XXIV МЮД'у. На здымку: Група студэнтаў на дэманстрацыі.
Фото В. Грунтфеста.

БРЫГАДЗІР КУШНЯРОВА

У светлым прасторным цэху жанчына сярэдніх год падышла да работніцы тав. Ражковай.

— Не забудзь, Анютка, сёння ў шэсць гадзін увечары трэба пайсці ў школу на заняткі.

— Тав. Кушнярова, у мяне рэпетыцыя драмгуртка.

— Рэпетыцыя,—крыху задумалася брыгадзір.—Нішто, я дагаварuся з кіраўніком драмгуртка і заняткі перанясем на другі дзень.

Работай, школай, самадзейнасцю работніц, усім, чым жывуць у брыгадзе, цікавіцца тав. Кушнярова.

У брыгадзе тав. Кушняровай 46 жанчын. Усе яны маладыя, бадзёрыя. Кожная імкнецца даць добрую якасць прадукцыі і высокія паказчыкі ў выкананні промфінплана. Аб іх упартай рабоце красамоўна сведчаць лічбы. За ліпень месяц брыгада выканала промфінплан на 140 проц.

— Я ганаруся маёй брыгадай. На кожным фабрычным сходзе яе прыводзяць у прыклад як лепшую,—гаворыць тав. Кушнярова.—Вось Анюта Ражкова, маладая работніца, стаханаўка, яна ў нас перадавы чалавек у брыгадзе. Промфінплан выконвае на 160 процантаў кожны месяц, дае высокую якасць прадукцыі. Яна адна з лепшых і ў грамадскай рабоце, у школе займаецца добра, чытае газеты, літаратуру.

— Ушывальшчыца-стаханаўка Ліза Гутарава план свой выконвае на 157 проц. Лепшы профарганізатар фабрыкі. Карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод работніц. Ліза сапраўды дысцыплінаваная. Яна паказвае другім прыклад у рабоце. Закончыла тэхнічную вучобу на „выдатна". У брыгадзе такіх работніц налічваецца многа.

Нямала прышлося з гэтымі работніцамі тав. Кушнярэвай папрацаваць.

— Дзяўчаты маладыя, усе з вёскі. Трэба было прывучыць да вытворчай дысцыпліны. Прагулы былі нярэдкім з'явішчам. Цяпер ужо гэтага няма.

Аднак непаладкі ў цэху падчас тармозяць нармальную работу стаханаўцаў. Вось, напрыклад, швейныя машынкі сістэмы „Рапіды" вельмі часта псуюцца. Іх бесперапынна трэба рамантаваць і рамантаваць, а работніцы ў гэты час стаяць і чакаюць заканчэння рамонта. А такія прастоі надта частыя.

Лепшыя стаханаўкі тт. Міхалькова і Казлова вельмі часта скардзяцца на тое, што пакалолі рукі і не могуць працаваць на неадрамантаваных машынках. Тав. Кушнярова звярталася да дырэктара, але ён ні ў чым ёй не дапамог. Між тым на складзе ёсць запасныя машынкі, якія патрабуюць невялікага рамонту і іх можна скарыстаць для вытворчасці.

Брыгада тав. Кушняровай адна з лепшых брыгад на фабрыцы „Герой труда". Яна дабілася такіх добрых паказчыкаў сваёй упартай і адданай работай. Брыгадзір Кушнярова выдатны арганізатар, вельмі чулы таварыш, карыстаецца вялікім аўтарытэтам сярод работніц.

Добруш. **Сімкіна Р.**

ДАПАМАГАЮ АДСТАЮЧЫМ

На канфетнай фабрыцы „Комунарка“ працую ўжо 8 год. Першы час была ўдарніцай. Потым, калі прачытала ў газеце аб слаўным пачыне Аляксея Стаханава і другіх людзей, якія паследвалі яго прыкладу, я таксама стала ініцыятарам стаханаўскага руху ў нас на фабрыцы. Пачала выконваць па паўтары і дзве нормы.

У мінулым годзе я таксама з газет даведалася, што работніца маскоўскай фабрыкі „Октябрь“ т. Юдзіна знайшла новы метад завёрткі цукерак. Ён заключаецца ў тым, што адначасова абодвума рукамі робяцца два наскі цукеркі. Гэта значна паскарае работу.

Тады-ж з нашай фабрыкі былі пасланы дзве работніцы ў Маскву для вывучэння метада тав. Юдзінай. Але я іх не дачакалася. Газету, дзе быў падробна апісан гэты метад, уважліва прачытала і праглядзела малюнкі. Назаўтра ўжо працавала па-новаму.

Першы дзень зрабіла 90 кілограм пры норме 60. Цяпер вырабляю па 135—140 кілограмаў.

Я дапамагаю ў рабоце другім. Вось нядаўна на фабрыку прышлі новыя работніцы. Многіх з іх вучыла работаць. Мае былыя вучаніцы тт. Гінзбург, Зубава, Юцкевіч сталі стаханаўкамі.

Маладая дзяўчына Стэфа Вацнеўская на фабрыцы працуе некалькі год. Работала дрэнна, часта прыходзіла пасля гудка, хадзіла па цэху, у час работы сама не рабіла і іншым перашкаджала. Уся змена смяялася, лодырам называлі яе.

Рашыла дапамагчы Стэфе. Пасадзіла яе радам з сабою і пачалі спаборнічаць. Паработала так з тыдзень і яна стала непазнавальнай. Зараз Стэфа стаханаўка, амаль двухсотніца.

Дапамагаць у рабоце адстаючым, каб дабіцца агульнага ўздыму—адна з галоўных задач кожнага стаханаўца. Гэта я добра зразумела і штодзенна ажыццяўляю.

Зінаіда Аляксандраўна Муха.

Менск.



Дэпутат Вярхоўнага Совета Узбекскай ССР за работай.

На здымку: Дэпутат Вярхоўнага Совета Узбекскай ССР, стаханаўка Ташкенцкай швейнай фабрыкі імя Горкага Рыхсі Ахарова, вылучаная на пасаду намесніка дырэктара фабрыкі (злева) навучае работніцу Хайры Іноятаву стаханаўскім метадам работы.

Фото М. Пенсона (Саюзфото).

Забылі аб стаханаўцах

Аднойчы ў 1936 годзе прышла з работы пазней звычайнага. Муж ужо быў дома, ляжаў на ложку і чытаў газету. Як толькі ўвайшла ў пакой, ён адразу пачаў гутарку:

— Глядзі, Палагея Паўлаўна, цуды якія на свеце творацца.

І прачытаў мне, як Аляксей Стаханаў, спусціўшыся ў шахту, у некалькі разоў перавыканаў сваю вытворчую норму.

— У нас на заводзе можна выпрацоўваць больш, чым па норме паложана, але ніхто не бярэцца за гэту справу,—сказала я мужу.

— А ты першай вазьміся, зрабі сама, а потым твайму прыкладу і другія работніцы паследуюць.

У адказ яму нічога не сказала, але пра сябе падумала,—абавязкова вазьмуся за справу, працаваць я люблю. Назаўтра выпрацавала амаль паўтары нормы. Потым усё больш і больш, і нарэшце стала выконваць дзве нормы. Вось тады і звярнулася да жанчын.—Давайце, возьмемся за справу па-сур'ёзнаму, паменш будзем расхаджваць па цэху, ды размаўляць, а будзем упарта працаваць.

Выклікала некалькі чалавек на спаборніцтва. Адставаць работніцам было соромна. У першы дзень вечарам падлічылі выпрацоўку і аказалася, што работніцы нашага цэха замест нормы 8 з паловай кілограм выпрацавалі па 10 і нават па 12.

Нават у газеце пісалі, што я з'яўляюся першым ініцыятарам стаханаўскага руху на заводзе „Большэвік“ і што па майму прыкладу многія жанчыны пачалі работаць па-стаханаўску. Цяпер я выконваю план на 180—200 проц. Са мною спаборнічае тав. Ермакова. Яна таксама стаханаўка.

Мы выпрацоўвалі 5 яшчэ больш, але ў нашай рабоце ёсць многа перашкод. Калі настае летні сезон, дык у першым хромавым цэху прастоі. Асабліва яны ўзмацніліся за апошні час. Па тры гадзіны ў дзень машыны прастойваюць з-за дрэннай арганізацыі снабжэння завода сыравінай. А скажы што-небудзь нашаму цэхкому ці дырэкцыі, яны аб гэтым і слухаць не хочуць.

Палагея Паўлаўна Валодзіна

Менск.

Пакончыць з бесклапотнасцю

Наша фабрыка ў свой час славілася знатнымі стаханаўцамі, якія паказвалі выдатныя ўзоры ў рабоце. Добрыя стаханаўцы ёсць у нас і цяпер. Але бяда ў тым, што ніхто імі не кіруе і што наогул у рабоце маецца шмат непаладкаў.

Стаханаўцам у нас не ствараюць умоў для работы і часта яны нават не выконваюць сваіх вытворчых заданняў. Вось, напрыклад, стаханаўкі Тычкова і Осіпава. Яны выпрацоўвалі па 85 скрынак у дзень, пры норме 60. Аднак вельмі часта ім прыходзіцца прастойваць па розных прычынах: то саломкі няма, то людзей не хапае, то станкі няспраўны.

Або такі факт. У зборачным цэху адпусцілі зменнага майстра ў адпачынак. Замяшчаць яго ўзяліся два майстры: тт. Перчыкаў і Каталкін. У выніку стварылася абязлічка, і ніхто з іх фактычна за змену не адказвае. Прыходзіцца чакаць поўгадзіны, пакуль Перчыкаў або Каталкін прымаюць змену і толькі пасля гэтага яны бяруцца за расстаноўку рабочай сілы. У выніку замест сямі гадзін увесь цэх работае шэсць з палавінай гадзін. Начальнік цэха, як і фабрычная адміністрацыя, на гэта не звяртаюць ніякай увагі.

Несвоечасова рамантуюцца і станкі. Нядаўна на вытворчай нарадзе работніцы расказвалі, што механік цэха Каровін са сваімі памочнікамі не забяспечвае своечасовы рамонт станкоў. У час работы яны займаюцца прыватнай работай, рамантуюць замкі, ключы, а калі работніца просіць іх справіць станок, то яны ёй у гэтым адмаўляюць. Станок, на якім работае стаханаўка Краснагорская, даўно трэба адрамантаваць, але гэтага не робяць.

Фабрыка выпускае дрэнную якасць прадукцыі. Галоўкі запалак выходзяць няроўнамерныя; бывае, што запалкі робяцца без парафіна. За тры дні макаль Дабравольскі прапусціў без парафіну больш 30 кісет запалак, і яны былі выкінуты ў печку.

Гэтымі днямі ў нас адбыўся сход рабочых, на якім прысутнічаў нач. кір. запалк. прамысловасці тав. Кузняцоў. На сходзе было абгаворана пытанне аб тым, чаму фабрыка не выконвае план. Многія работніцы выступілі ў спрэчках і ўказвалі на рад недахопаў. Стаханаўка Тычкова гаварыла, што калі 20 жніўня ёй былі створаны нармальныя ўмовы для работы, то яна за змену выпрацавала 80 скрынак, а ў іншыя дні, з-за розных непаладкаў, яна выпрацоўвае ўсяго 58—60 скрынак. Тав. Тычкова ўзялася выпрацоўваць і па 105 скрынак за змену, толькі паставіла адну ўмову—даць магчымасць работаць поўных 7 гадзін і ўстараніць маючыяся непаладкі.

Фабрыка „Везувій“ мае ўсе магчымасці не толькі выконваць, але і перавыконваць вытворчы план. Трэба толькі, каб адміністрацыя, заўком і партком лепш кіравалі стаханаўскім рухам, трэба толькі павысіць іх адказнасць за выкананне плана 1938 года.

Майстар Шэвелева.

Нова-Беліца.

Комсамольцы-стаханаўцы Менскай шчотачнай фабрыкі імя Крупскай у выходны дзень у парку. Злева направа: В. М. Юсна, К. К. Окуліч і Е. Б. Каплан. Фота Л. Мазелева (СФ.)

ЗА БОЛЬШЫЯ ПОСПЕХІ

Я паступіла на завод у пачатку 1936 года. Мяне паставілі да рэвальвернага станка на точку і падрэзку ролікаў. Работа не асабліва складаная. Але ўсё-ж да кожнай работы трэба прызвычаіцца, і амаль месяц прайшоў, пакуль я пачала выконваць норму.

Норма выпрацоўкі тады была невялікая—усяго 17 кілограм, але і яе большасць работніц не выконвала. Прычын тут было многа, галоўная тая, што штамповачны цэх выпускаў нядобраякасныя дэталі.

К гэтаму часу па ўсёй краіне ўжо разгарнулася магутная хваля стаханаўскага руху і мы, рэвальвершчыцы, рашылі прыкласці ўсе сілы, каб узняць прадукцыйнасць працы. Перш за ўсё мы патрабавалі ад адміністрацыі завода дабіцца таго, каб штамповачны цэх пачаў даваць добраякасныя дэталі. Пачалі думаць і абгаварваць, як лепш наладзіць працу.

Раней мы ўсё рабілі правай рукой—бралі ролік, заціскалі яго і гэтай-жа рукой падразалі. Гэта займала вельмі многа часу. Потым пачалі падразаць левай рукой. Спачатку было неяк нязручна, але ўжо праз дзень-другі норма выпрацоўкі рэзка ўзнялася. Я пачала выконваць план на 250—280, а часам і на 300 проц.

Усім нам было відавочна, што старыя нормы не рэальныя, што іх неабходна перагледзець. Пасля іх перагляду зноў пачала выпрацоўваць 150—180 проц. плана. Увесь 1938 год даю 205—210, а часам і больш процантаў. Я стараюся ўсё больш удасканальваць працэс работы, зрабіць так, каб ні адна з 420 рабочых мінут не прапала дарэмна. Папрасіла, каб мне зрабілі баначку, і ролікі стаўлю блізка каля сябе. Гэта дае магчымасць амаль зусім не адрывацца ад работы.

На завод прыходзяць новыя работніцы. Для іх работа непрывычная і многія спачатку норм не выконваюць. Я стараюся ім дапамагаць. Падстаўлю падставачку, каб зручней было стаяць каля станка, пакажу, як падразаць левай рукой і яны ўжо лепш пачынаюць працаваць.

Трэба сказаць, што на заводзе ў нас яшчэ да гэтага часу працуюць „штурмамі". Перад якім-небудзь святам або гадавінай пачынаецца гарачка. Тады ў цэх паступаюць добраякасныя дэталі, інструмант добры, усё падаецца да станка, нам не прыходзіцца адлучацца. А гэта неабходна рабіць заўсёды, штодзённа, каб мы маглі-б даваць яшчэ большы процант выпрацоўкі.

Мацюшэвіч Ніна.

Стаханаўка-рэвальвершчыца Менскага завода ланцугоў „Галя".

Стаханаўка матальнага цэха фабрыкі імя Клары Цэткін (Віцебск) т. Віннікава Е. А. значна перавыконвае план.
На здымку: Тав. Віннікава за работай. Фото В. Валодзіна (Саюзфото).

ВЯЛІКАЕ ЗВАННЕ СТАХАНАЎЦА АПРАЎДАЮ.

Мая спецыяльнасць—лакіроўка грэбянёў. Дзевяць гадоў працую на гэтым працэсе. Яшчэ да пачатку стаханаўскага руху працавала не дрэнна—сістэматычна выконвала і перавыконвала норму. З пачаткам-жа стаханаўскага руху я таксама, як і многія нашы работніцы, уключылася ў гэты рух, і трэба сказаць, што дабілася значных поспехаў.

Пасля ўключэння ў стаханаўскі рух я пачала выконваць норму больш чым на 200 процантаў.

Дабілася сваіх поспехаў толькі шляхам максімальнага ўшчыльнення рабочага часу.

Раней лакіравалі па аднаму грэбеню. Я пачала браць разам два, і гэта значна ўзняло норму выпрацоўкі. Пачала спраўляцца з усёй работай адна, і другую работніцу, якая раней разам са мною працавала, перакінулі на іншую работу.

На галіннай канферэнцыі я ўнесла прапанову аб пераглядзе норм, аб узняцці іх да 76 сацень.

Зараз і гэтую норму таксама выконваю на 230—260 процантаў (лакірую разам па 3 грэбені). Праз маё аддзяленне праходзіць таксама і лакіроўка цэлулоідных гузікаў. Тут я дабілася значнай эканоміі ацэтону, парамі якога лакіруецца прадукцыя. Замест вялікага бачка прыстасавала для гэтай мэты маленькую пасуду.

За апошні час унесла рад рацыяналізатарскіх прапаноў. Некаторыя з іх, як матанне нітак, чыстка грэбянёў, прыняты і выкарыстаны.

На фабрыцы я працую з першага дня яе існавання. Яна ператварылася для мяне ў родны дом. Апраўдаць вялікае званне стаханаўца—чалавека сталінскай эпохі—і работаць яшчэ лепш—мая галоўная задача.

Сыпнеўская Ю. А

Стаханаўка галантарэйнай фабрыкі імя Фрунзе.

ГІСТАРЫЧНЫЯ РАШЭННІ.

Другая Сесія Вярхоўнага Совета СССР праходзіла ў той час, калі міжнароднае становішча было асабліва абвостраna. Японская ваеншчына пачала вайну. Яна хацела ўцягнуць у вайну Японію з Совецкім Саюзам. Але наша слаўная Чырвоная Армія дала рашучы адпор зарваўшымся самураям. Зоркія вартавыя паказалі гэтым абнаглелым захватчыкам несакрушальную сілу нашага Саюза.

Сесія рашала ўсе пытанні з асобай дзелавітасцю і дэтальнасцю. Першае пытанне, якое абмяркоўвалі абраннікі народа, — гэта адзіны дзяржаўны бюджэт СССР. Усе артыкулы гэтага дакумента, ад першага да апошняга, пранікнуты таржаствам соцыялізма ў нашай краіне. Кожная яго лічба з усёй яскравасцю сведчыць аб велізарным росце заможнага і культурнага жыцця нашага свабоднага народа.

Няма ў свеце такой краіны, дзе-б адпускалі столькі сродкаў на дабрабыт і патрэбы працоўных. Няма такой галіны ў народнай гаспадарцы, якая-б не была ўлічана пры зацвярджанні адзінага дзяржаўнага бюджэта. З асобым натхненнем і аднадушшам дэпутаты віталі асігнаванні на абарону нашай краіны. У прамовах выступаючых дэпутатаў ад імя ўсіх сваіх выбаршчыкаў гучэлі словы свяшчэннага доўга—груддзю абараняць нашу цудоўную краіну і яе народ.

Нельга не адзначыць такі факт, што выступаючыя ў спрэчках, асабліва тав. Нікалаева, рэзка крытыкавалі Наркамат Аховы Здароўя Беларусі, які няўмела выкарыстаў асігнаваныя грошы па бюджэту мінулага года на культурныя і бытавыя мерапрыемствы. Толькі дрэннай пастаноўкай работы можна растлумачыць, што па гарадскіх больніцах пры гадавым выкарыстанні кожнай больнічнай койкі было прадугледжана 330 дзён, а выкарыстана 319 дзён. У сельскіх больніцах замест 300 дзён выкарыстана 283 дні. Па яслях таксама замест 330 дзён —234 дні. Між тым бывае, што работніцам адмаўляюць у прыёме дзяцей у яслі, спасылаючыся на адсутнасць месц.

Другое пытанне павесткі дня—„Палажэнне аб судаўстройстве СССР, саюзных, аўтаномных рэспублік".

Па гэтаму пытанню, як і па першаму, спрэчкі і яго рашэнні праходзілі на высокім ідэйна-палітычным узроўні.

Пры зацверджанні закона аб грамадзянстве СССР кожны дэпутат яшчэ і яшчэ раз быў пранікнут тым вялікім пачуццём гордасці, што ён з'яўляецца прадстаўніком такога цудоўнага і слаўнага народа вялікага Совецкага Саюза. Быць грамадзянінам СССР—гэта гучыць горда і радасна.

Дэпутаты зацвердзілі „Закон аб парадку ратыфікацыі і дэнансацыі міжнародных дагавораў СССР". Яны заявілі, што міжнародныя дагаворы павінны быць непарушальнымі.

З асобай актыўнасцю Сесія абмяркоўвала пытанне аб падатку на коней аднаасобных гаспадарак. Гэты закон мае вялікае значэнне для калгаснай вёскі Беларусі. Я ведаю з вопыта колькі ўгодна выпадкаў, калі аднаасобнікі спекулююць і зарабляюць па некалькі сот рублёў у дзень на кані, а падатак плацілі зусім нязначны. Нашы калгасы і калгаснікі жывуць поўнакроўным культурным і заможным жыццём, і яны не хочуць, каб аднаасобнікі папіралі совецкія законы, мелі перавагу над калгаснікамі.

Сесія таксама разгледзела пытанне аб сельскагаспадарчай выстаўцы і зацвердзіла ўказы прэзідыума, прынятыя паміж Першай і Другой Сесіямі.

Усе прынятыя законы і рашэнні Другой Сесіі Вярхоўнага Совета СССР з'яўляюцца баявой праграмай дзеяння дэпутатаў Вярхоўнага Совета СССР і ўсяго нашага народа. Чоткае і беспярэчнае выкананне іх з'яўляецца свяшчэнным доўгам кожнага працоўнага. Мы павінны давесці да свядомасці мас і шырока папулярызаваць гэтыя гістарычныя дакументы сталінскай эпохі.

Мне, як дэпутату, вельмі цяжка словамі перадаць тыя пачуцці гордасці і радасці за нашу квітнеючую радзіму, якія адчуваліся на працягу ўсёй работы Сесіі.

З'яўленне ў зале правадыра народаў вялікага Сталіна і яго бліжэйшых саратнікаў заўсёды выклікала буру апладысментаў і авацый. Гарачыя прывітанні бязмежнай любві і адданасці да любімага друга, бацькі і настаўніка таварыша Сталіна раздаваліся ва ўсіх кутках зала пасяджэнняў на мовах усіх нацыянальнасцей, насяляючых Совецкі Саюз.

С. П. Рачок.

Дэпутат Вярхоўнага Совета СССР.

Дэпутат Вярхоўнага Совета БССР—старшыня калгаса „Чырвоны баец", Бабруйскага раёна, член КП(б)Б У. І. Прохарэнко (злева) гутарыць з прынятымі ў кандыдаты КП(б)Б сельскай зоны Бабруйскага раёна.

Фото Л. Мазелева (Саюзфото.).

МЫ ПАВІННЫ ПЕРШ ЗА ЎСЁ НАВ...ЧЬ

Церахава—інструктар цэха

ВЫЛУЧЫЛІ І ЗАБЫЛІ

Я хачу расказаць гісторыю майго вылучэння.

Восем год працую на фабрыцы. З'яўляюся адной з першых стахановак. Увесь час паказвала прыклады ў рабоце. Заўсёды мела найлепшыя водгукі аб сваёй рабоце, неаднаразова была прэміравана. Потым паўстала пытанне аб вылучэнні мяне і яшчэ некаторых работніц на больш адказную работу.

Вынеслі рашэнне аб вылучэнні нас на тую ці іншую работу, а ў гэты самы час на гэтыя пасады паставілі другіх людзей. Больш года цягнулася справа з нашым вылучэннем. Аб ім пісала нават і раённая газета. Нарэшце, усё-ж успомнілі. Зараз я працую інструктарам у цэху. За ўвесь час са мною, як і з іншымі вылучэнкамі, ніхто нават не пагутарыў. Не запытаўся, як спраўляюся з работай, цяжка мне ці лёгка. Не запыталіся, ці патрэбна мне дапамога. Нікога гэта не цікавіць,—вылучылі і з плеч далоў.

Я стараюся работаць аддана. Але ўсё-ж я на гэтай пасадзе нядаўна, і калі-б хто прыглядзеўся, пацікавіўся-б маёй работай, дапамог-бы мне, то было-б значна лепш.

У мяне, як і ва ўсіх нашых вылучэнак, аграмаднае жаданне вучыцца, павышаць свае веды. Мы жадаем павышаць не толькі тэхнічныя, але і палітычныя веды. Мы з'яўляемся камандзірамі вытворчасці, і, зусім зразумела, павінны быць палітычна свядомымі людзьмі. Але, на вялікі жаль, мы не маем магчымасці гэтага дасягнуць. Гуртковў у нас амаль ніякіх няма. Нават заняткі ў палітгуртках праводзяцца вельмі рэдка. Партыйны камітэт ні аднаго разу не выклікаў нас, не пацікавіўся даведацца як працуем, як расцем, якая дапамога патрабуецца.

Мы з вялікай радасцю работаем на карысць радзіме. Мы ўдзячны партыі і Совецкай уладзе, што нас вылучаюць, але мы патрабуем ад партыйнай арганізацыі і адміністрацыі фабрыкі канкрэтнага кіраўніцтва, патрабуем увагі да сябе і тады мы, безумоўна, будзем работаць так, як ад нас гэтага патрабуе партыя Леніна—Сталіна. І давер'е, аказанае нам, з гонарам апраўдаем.



Партыйная арганізацыя Віцебскай швейнай фабрыкі „Сцяг індустрыялізацыі" сістэматычна праводзіць работу з жанчынамі-кандыдатамі партыі.

На здымку: Парторг палітовага цэха фабрыкі т. Бегер праводзіць заняткі гуртка па палітграмаце; (злева направа) тт. Папкова, Д., Роніна А., Лаздан Ф., Бароўчанка Н. і Фрадкова С.

Фото Почкаева (Саюзфото).

Партыя і асабіста таварыш Сталін вылучэнню жанчын на кіруючую работу, выхаванню.

Тысячы жанчын працуюць нас работах—кіраўнікамі прадпрыемстваў, нікамі, наркомамі, пракурорам т. д. сваю адданасць партыі Леніна-Сталіна вающь аказанае ім давер'е.

На Бабруйскай швейнай фабрыцы сама як і на многіх іншых швейных тары, прыёмшчыкі, майстры-вылучэнцы якія працуюць аддана і гараджанкі лепш. Аднак кіраўніцтва фабрыкі, партыйныя арганізацыі забыліся, што справы, што галоўнае—штодзённая і практычная дапамога вылучэнцам рыцы няма.

На цэхавай нарадзе, правераючы паючых крытыкавалі кіраўніцтва могі ў рабоце.

Ніжэй мы друкуем некаль

Суха

Клапатліва вы...ш

Я хачу расказаць аб недахопах, якія ёсць у нашай рабоце.

Я працую на кіруючай рабоце на фабрыцы больш двух год. І лічу сябе ўжо не з маладых вылучэнак і таму мне асабліва хочацца расказаць аб тым, як кіруюць тут вылучэнкамі, як цікавяцца работай, як іх выхоўваюць.

Варта ў нас каго-небудзь вылучыць, як заўтра аб ім забываюцца. Вылучэнкі прадастаўлены самім сабе і працуюць як могуць. Я не памятаю ні аднаго такога выпадку, каб склікалі на нараду, запыталіся-б, ці патрэбна нам якая-небудзь дапамога. Наогул, у парткоме, у фабкоме, або дырэкцыі ніколі не ставілася пытанне аб рабоце каго-небудзь з нас.

Мне без дапамогі, без указанняў асабліва цяжка справіцца з работай.

У 1936 г. мяне вылучылі культработнікам на станцыю Бярэзіна. За ўвесь час нікому і ў галаву не прышло нават пазваніць, даведацца, як я працую. Між тым, на фабрыцы я прапрацавала з самага пачатку яе існавання. Была перадавой і заслужыла, каб маёй работай цікавіліся.

Праз некаторы час я зноў вяр-

...ЫЦЦА ЦАНІЦЬ ЛЮДЗЕЙ (І. СТАЛІН)

...лін надаюць вялікую ўвагу
...работу і іх клапатліваму

...ас на адказных кіруючых
...ў, цэхаў, партыйнымі работ-
...д. Яны на справе даказалі
...аліна і з гонарам апраўд-

...цы імя Дзержынскага, так
...прадпрыемствах, інструк-
...учэнкі з былых работніц,
...аданнем працаваць яшчэ
...партыйныя і прафесіяналь-
...вылучэнне яшчэ палова
...клапатлівае выхоўванне
...Гэтага, на жаль, на фаб-

...рэдакцыяй, многія з высту-
...брыкі за адсутнасць дапа-

...ступленняў з нарады.

...амеснік старшыні фабкома.

...ачваць кадры

...ся на фабрыку. Мяне прызна-
...тэхпропам. Работа новая, не-
...мая, але і тут ні аднаго ўка-
...я, ні дапамогі не атрымала.
...очаш, так і працуй.
...раз працую намеснікам стар-
...і фабкома. Прыходзіцца аб-
...оўваць 1.500 чалавек. І зноў-
...вымушана работаць як сама
...мею, між тым, я пры належ-
...дапамозе і кіраўніцтве магла-б
...таць значна лепш.
...сь яшчэ адно ненармальнае
...шча. У нас устанавілася тра-
...я к Міжнароднаму жаночаму
...8 сакавіка прэміраваць леп-
...работніц, вылучаць найбольш
...давых і здольных на кірую-
...работу. Праходзіць 8 сакавіка
...вылучэнні больш не думаюць.
...ўрачыстым вечары рабочых
...ыкі, прысвечаным святкаванню
...народнага жаночага дня ў гэ-
...годзе, было зачытана рашэнне
...ылучэнні некаторых работніц—
...коўскай, Дзятловай і іншых.
...го часу прайшло поўгода, а
...энне аб вылучэнні засталося
...кі ўрачыстай дэкларацыяй.
...е становішча з'яўляецца про-
...здзекамі над работніцамі.
...дры трэба вучыць, выхоўваць
...ды яны будуць работаць са-
...ды па-сталінску.

Мельцэр—прыёмшчыца цэха.

Не лічацца з вылучэнкамі

За апошні час у нас на фабрыцы імя Дзержынскага вылучана многа жанчын на кіруючую работу. Прыёмшчыкі, інструктары, некаторыя майстры і намеснік дырэктара фабрыкі—гэта ўсё былыя работніцы, лепшыя людзі нашай фабрыкі, якія даказалі сваю бязмежную адданасць партыі Леніна—Сталіна.

На нарадзе расказвалі аб тым, што вылучэнне некаторых цягнулася па году і больш, расказвалі аб тым, што вылучаным не аказваецца абсалютна ніякай дапамогі. Усё гэта вельмі правільна. Я хачу яшчэ дадаць да таго, што гаварылі папярэднія таварышы.

Я, як і большасць вылучэнак, работаю на фабрыцы з першага дня яе існавання. Да апошняга часу працавала ў станка. З задачамі, якія стаялі перада мною, як работніцай, я спраўлялася не дрэнна. Некалькі разоў была прэміравана за ўдарную работу. У грамадскім жыцці таксама ўдзельнічаю актыўна.

Партыйныя і грамадскія арганізацыі фабрыкі рашылі вылучыць мяне на кіруючую работу. Безумоўна, справа не дрэнная. Але трэба пагаварыць з чалавекам перад тым, як яго вылучаць, ці задавальняе яго тая ці іншая работа. Але гэта ў нас на фабрыцы не практыкуецца. Са мной не палічылі патрэбным параіцца, на якую работу я жадала-б пайсці.

Як вырашалася пытанне аб маім вылучэнні? Мне проста сказалі—ты будзеш прыёмшчыцай. Гэта вялікая і адказная работа, але я прасіла даць мне іншую, больш жывую работу, бо не люблю сядзець на адным месцы. Але мне адказалі:—„ідзі, куды пасылаюць, інакш ты ўсё жыццё будзеш сядзець у ленце".

Перспектыва сядзець у ленце мяне нікольки не палохае, наадварот, гэта вельмі пачэснае месца. Я восем год з гонарам прапрацавала на ім. Мяне толькі абураюць такія адносіны да выхавання і вылучэння кадраў.

Аб дапамозе вылучэнкам. Ні аб якой дапамозе не можа быць і гутаркі, бо яе няма. Утвараецца ўражанне, што і для парткома і для дырэкцыі важна толькі лічба вылучэнак, а далейшым лёсам гэтых людзей ніхто не цікавіцца. Я лічу такое становішча ненармальным. Наш правадыр Іосіф Вісарыёнавіч Сталін вучыць нас штодзённа дапамагаць, клапатліва вырошчваць кадры, вучыць людзей на рабоце. Кіраўніцтву фабрыкі неабходна ўлічыць патрабаванні вылучэнак і як след наладзіць з імі работу.



На станцыі Асіпавічы Беларускай чыгункі лепшай стрэлачніцай з'яўляецца Чэмерыс А. Яна ўзорна ў чыстаце ўтрымлівае чыгуначныя стрэлкі. Тав. Чемерыс падрыхтавала стрэлачніцай Кацю Казей.

На здымку: Чэмерыс А. (справа) і Казей К. Фото Лапідуса (Саюзфото).

Раскрыліся дзверы школы

1 верасня пасля летніх канікул шчаслівая, бадзёрая, жыццерадасная дзетвара пераступіла парог школы. Раніцой, яшчэ задоўга да пачатку заняткаў, каля школы былі чутны звонкія галасы дзяцей. Як да лепшага свята, яны ўсе апрануліся ў свае новыя сукенкі, касцюмы. Выглядалі асабліва радасна. А радасці першакласнікаў не было канца.

— Вось нарэшце і мы—школьнікі.

33-я школа ў гэтым годзе не дрэнна падрыхтавалася да сустрэчы дзяцей. Зроблен рамонт. Школа забяспечана ўнутраным абсталяваннем. Ёсць усе ўмовы для таго, каб калектыў настаўнікаў разам з вучнямі дабіўся ўзорнай пастаноўкі вучобы.

Мы ўключыліся ў соцыялістычнае спаборніцтва за лепшую паспяховасць вучняў, за высокую дысцыпліну, за добрую пастаноўку палітвыхаваўчай работы. Мы будзем усямерна змагацца, каб школа была перадавой па ўсіх паказчыках.

У гэтым навучальным годзе мы павінны дабіцца, каб другагодніцтва было даведзена да нуля. На жаль, у мінулым годзе мы мелі факты другагодніцтва. Некаторых нават нельга было дапусціць да паўторных іспытаў. Так было з вучнямі нашай школы Д. і І., якія да лекцый зусім не рыхтаваліся. Мы іх вымушаны былі пакінуць на другі год. Так было і з вучаніцай IV класа С. У пачатку заняткаў яна некалькі разоў прыходзіла ў школу з абяцаннямі, што будзе вучыцца добра і ў працэсе вучобы выправіць свае мінулагоднія памылкі. Аднак зараз аб гэтым гаварыць было позна. Яна засталася непісьменнай і не перайшла ў 5 клас. Наша задача не дапускаць падобнага становішча. Трэба дзецям прывіць любоў да ведаў і ўнушыць пачуцці адказнасці за вучобу.

Навучальны год пачаўся, але Горана не патурбаваўся своечасова ўкамплектаваць нашу школу настаўнікамі. Яшчэ зараз нехапае выкладчыка па беларускай мове.

Перад намі стаяць аграмадныя задачы. Мы павінны выхоўваць у дзяцей пачуцці бязмежнай адданасці і любві да нашай радзімы, да партыі Леніна—Сталіна. Мы павінны падрыхтаваць дзяцей высока-граматных, усебакова развітых грамадзян Вялікага Совецкага Саюза. З гэтымі задачамі з гонарам справімся дружнай і адданай работай ўсяго калектыва.

Я. Сікорская—загадчык навучальнай часткі 33-й школы.
Менск.

Вучаніца Бабруйскай музыкальнай школы па класу скрыпкі, выкладчыка Т. Ц. Каплана, дванаццацігадовая Іма Ліўшыц паступіла ў Кіеўскую музыкальную школу пры Дзяржаўнай кансерваторыі па класу скрыпкі заслужанага дзеяча мастацтва прафесара-ордэнаносца Магазінера.

Фото Л. Мазелева (Саюзфото).

Па слядох неапублікаваных пісем

Калгасніца Гарэльчанка В. М. з калгаса „Чырвоны Рассвет", Брагінскага раёна, нядаўна нарадзіла двайню. Яна напісала пісьмо ў рэдакцыю з просьбай дапамагчы набыць для рэбят камплекты бялізны. Наркамат Аховы Здароўя БССР, куды рэдакцыя накіравала пісьмо, паслаў тав. Гарэльчанка за кошт Наркамата 144 метры мануфактуры і два дзіцячых ложкі.

Тав. Гарэльчанка прыслала ў рэдакцыю пісьмо, у якім горача дзякуе партыю і ўрад за вялікія клопаты аб мацерах і дзецях.

ВЫХАВАЕМ ГАРАЧЫХ ПАТРЫЕТАЎ РАДЗІМЫ

Совецкае настаўніцтва адчувае на сабе выключныя клопаты і ўвагу большэвіцкай партыі, совецкага ўраду і асабіста лепшага друга і правадыра таварыша Сталіна. Мы, настаўнікі, жадаем работаць лепш, чым у мінулым годзе. Работаць так, каб апраўдаць давер'е народа, каб краіна сапраўды магла ганарыцца сваім настаўніцтвам, каб партыя і асабіста таварыш Сталін сказалі: „совецкае настаўніцтва работае на выдатна".

Я работаю выкладчыкам геаграфіі. Кожны дзень адчуваю бязмежны інтарэс да сваёй радзімы ў нашай пытлівай, прагнай да ведаў совецкай дзетвары. З якой зацікаўленасцю яны слухаюць лекцыю геаграфіі! Колькі новых пытанняў узнікае ў іх на лекцыях — усё хочуць ведаць! Гэта робіць асабліва цікавым працу настаўніка геаграфіі. Гэта дае многа энергіі для работы, для перамогі тых цяжкасцей, якія яшчэ сустракаюцца на шляху географаў (не заўсёды здавальняючыя падручнікі, адсутнасць рада наглядных дапаможнікаў, недахоп мастацкай літаратуры для пазакласнай чыткі па геаграфіі і т. д.). Не гледзячы на гэта, я заўсёды імкнуся задаволіць запытанні вучняў.

Да лекцыі рыхтуюся сур'ёзна і глыбока. Падрыхтоўваю сама ці з вучнямі наглядныя дапаможнікі (каштоўныя ўказанні можна знайсці ў журнале „География в школе"), падбіраю адпаведную мастацкую літаратуру. Імкнуся матэрыял на лекцыі прынаднесці цікава. Расказваючы аб граніцах нашай радзімы ў 7 класе, я застанаўліваю ўвагу вучняў на капіталістычным акружэнні СССР, аб двух ачагах вайны, аб разбойнічых планах правячых клік фашысцкіх дзяржаў, якія імкнуцца „падправіць" геаграфію света уласцівым ім бандыцкім захопніцкім метадам.

Расказваю ім аб героях-пагранічніках, якія і днём і ноччу, у холад і дождж, пад спякотнымі праменнямі сонца ахоўваюць нашы непрыступныя граніцы; аб Чырвонай Арміі, ахоўваючай мірную працу совецкага народа, шчасце сталінскай дзетвары; аб тым, што нашу краіну ахоўвае ўвесь 170-мільённы совецкі народ і кожны гатоў стаць грудзю на абарону радзімы соцыялізма.

Дзеці любяць геаграфію. Аб гэтым сведчыць тое, што ў мінулым навучальным годзе я дабілася таго, што з 400 вучняў усяго не паспяваў адзін.

У гэтым навучальным годзе лічу сябе абавязанай дабіцца лепшых рэзультатаў. Прыступіла да арганізацыі гуртка па геаграфіі, вывесіла карту, дзе адзначаюцца важнейшыя падзеі як у СССР, так і на міжнароднай арэне; даручыла гэту работу вучням 8 і 9 класа. Намеціла рад другіх мерапрыемстваў: геаграфічны вечар, геаграфічную пляцоўку і інш. Абсталявала геаграфічны кабінет.

Я з'яўляюся таксама класным настаўнікам 5-б класа. Гэта накладае на мяне вялікія абавязкі ў справе выхаваўчай работы сярод вучняў. Прыкладу ўсе намаганні к таму, каб клас не меў другагодніцтва, каб па ўсіх прадметах рэбяты паспявалі на „добра" і „выдатна".

Буду імкнуцца к таму, каб кожнага вучня выхаваць адданым, стойкім барацьбітом за справу Леніна—Сталіна, за радзіму. Пастараюся ўсямерна ўкараніць у сазнанне рэбят правілы соцыялістычнага агульнажыцця, большэвіцкай культуры.

Буду трымаць цесную сувязь з бацькамі, пастаянна раіцца з імі, прыцягваць іх да работы ў школе, у класе і разам з імі даб'юся жаданых поспехаў.

Іофан А. А.
настаўніца 47-й Сталінскай школы—Менск.

Лёні Дворкіну і Раі Салаўёвай споўнілася 8 год. Яны прыняты ў першы клас 47-й менскай школы. Фото Л. Мазелева і Б. Вернера (СФ).

БОЛЬШ ТАВАРАЎ ШЫРОКАГА СПАЖЫВАННЯ

Пастановай Соўнаркома СССР на Наркаматы лясной, абароннай і цяжкай прамысловасці ўскладзены вялікія задачы па расшырэнню вырабу тавараў шырокага спажывання.

Гэты важнейшы дакумент ураду з'яўляецца разгорнутай праграмай работы заводаў і фабрык для большага выпуска тавараў шырспажыву. Пасля пастановы СНК СССР заводу імя Кірава таксама быў даведзен план вырабу.

Як-жа калектыў рабочых справіўся з гэтай задачай? За сем месяцаў гэтага года цэх шырспажыву даў дзяржаве прадукцыі на 327 тысяч рублёў, што складае выкананне гадавога плана на 93 проц.

Такіх станоўчых рэзультатаў у сваёй рабоце цэх дабіўся таму, што паміж рабочымі шырока разгорнуты соцыялістычныя метады працы. Усе 45 рабочых спаборнічаюць паміж сабой на лепшае і хутчэйшае выкананне плана. Рабочыя цэха шырспажыву паказваюць сапраўдныя стаханаўскія метады работы. Стаханаўцы Бурскі, Андрыянаў дзённую норму выконваюць на 300 проц. Тав. Бурбоўскі—на 270.

Цэх шырспажыву па асобаму заказу ў самы кароткі тэрмін даў для калгасаў к часу ўборкі сена некалькі тысяч малаткоў і бабак. І гэтым самым забяспечыў своечасова касцоў неабходнымі рэчамі для касьбы.

Аднак нядрэнныя паказчыкі ў выкананні плана ні ў якім разе не даюць права кіраўніцтву завода заспакайвацца на дасягнутым. На прадпрыемстве ёсць яшчэ цэлы рад ненармальнасцей, якія тармозяць яшчэ большы выпуск тавараў шырокага спажывання.

Узяць такі факт. На заводзе праведзен збор прапаноў па вырабу новых тавараў шырокага спажывання. Гэта ініцыятыва не ўзначалена кіраўніцтвам завода. Рабочыя ўнеслі звыш 20 каштоўнейшых прапаноў для расшырэння асартымента вырабаў цэха. Адчак гэтыя прапановы застралі ў канцылярыях фабрыкі. Заводскі камітэт, які павінен усямерна падтрымліваць і садзейнічаць рабочым у ажыццяўленні іх прапаноў, стаіць у баку ад гэтай справы.

Дырэкцыя і кіраўніцтва цэхам таксама не змагаюцца за хутчэйшае і ўмелае асваенне тэхнічных працэсаў рабочымі. Некалькі месяцаў таму назад рабочыя асвайвалі выпуск такой важнай рэчы як прымусныя гарэлкі, але і да апошняга часу цэх не прыступіў да іх вырабу.

Трэба адзначыць яшчэ і тое, што асартымент вырабу тавараў цэхам вельмі малы. Выраблюцца малаткі чатырох відаў, рашпілі, драчкі і латы сапожныя. Тавары, якія патрэбны для хатняга ўжытку, не выпускаюцца.

Ні ў адным магазіне горада Менска не знойдзеш дзяшовых вілак, лыжак, кухонных нажоў. Не знойдзеш кручкоў, зашчэпак для дзвярэй, трыножак, маленькіх хатніх замкоў. Ці-ж гэтых прадметаў цэх шырспажыву завода імя Кірава не могбы выпускаць? У яго ёсць на гэта ўсе магчымасці. Бяда толькі ў тым, што кіраўніцтва завода, Наркаматы лёгкай і мясцовай прамысловасці не прыслухоўваюцца да запатрабаванняў шырокіх мас насельніцтва.

Старавойтава.

Менск.

На здымку: Лепшая стаханаўка-калгасніца 1-й паляводчай брыгады пагранічнага калгаса „Победа", Дрысенскага раёна, т. Абуховіч Х. В. на малацьбе. Фота Валодзіна (Саюзфото.)

Капітан СЦЕЖЭНКА

ШТО АДБЫЛОСЯ Ў РАЁНЕ ВОЗЕРА ХАСАН?

(Запіскі ўдзельніка баёў)

*

Пасьецкі раён, самая паўднёвая частка Далёкаўсходняга прыморʻя, мала вядомы ў заходняй частцы Совецкага Саюза, аднак ён мае вельмі важнае значэнне. Тут зыходзяцца граніцы СССР, Манчжурыі і Карэі.

Наша граніца з поўдня на поўнач спачатку праходзіць па рацэ Тумень-Ула, аддзяляючы совецкую тэрыторыю ад Карэі. Працягнуўшыся так каля 25 кіламетраў, граніца з Карэяй пераходзіць у граніцу з Манчжурыяй і адступае ад ракі. У гэтым месцы паміж СССР і Карэяй укліньваецца доўгім вузкім языком тэрыторыя Манчжурыі.

Пагранічны ўчастак Пасьецкага раёна багаты нізінамі і азёрамі. Адно з азёр за апошні час стала вядома ўсяму свету. Гэта—возера Хасан з прылягаючымі да яго з захаду высотамі Заазёрнай (Чанкуфын) і Безымяннай, дзе совецкія пагранічнікі і войскі Прыморскай 1-й арміі на працягу 12 дзён вялі ўпорныя баі з японскімі захватчыкамі, пасягнуўшымі на недатыкальнасць совецкай тэрыторыі.

Чаму японская ваеншчына выбрала для новай узброенай авантуры раён возера Хасан?

Адказ на гэта пытанне трэба шукаць у характары мясцовасці і асаблівасцях тапаграфіі Пасьецкага раёна.

Возера Хасан і размешчаная каля яго града вышынь, або сопак, як іх называюць у нас у Прыморʻі, знаходзіцца ўсяго ў 10 кіламетрах ад берагоў Ціхага акіяна, а па прамой—у 130 кіламетрах ад Владзівастока.

Калі ля Владзівастока граніца адстаіць ад узбярэжжа яшчэ параўнаўча далёка, кіламетрах у 60—70, то чым далей на поўдзень, тым усё бліжэй і бліжэй падыходзіць яна да берага Японскага мора. Тут мясцовасць прадстаўляе сабой вузкую прыбярэжную паласу, скрозь балоцістую і нізінную, дзе рух магчым толькі па нямногіх сцежках і прасёлачных дарогах. Далей на поўнач, аж да Владзівастока, усё узбярэжжа складае таксама нізіннасць, якая шырока адкрываецца перад вачыма з нешматлікіх сопак, якія ўзвышаюцца над балоцістай раўнінай.

Такімі сопкамі, адкрываючымі від на Пасьецкі заліў, зʻяўляюцца вышыні Заазёрная (Чанкуфын) і яе суседка з поўначы—Безымянная, па вяршынях якіх праходзіць граніца, устаноўленая Хунчунскім дагаворам.

Як Заазёрная, так і Безымянная складаюць вяршыні аднаго і таго-ж скалістага кража, які спускаецца на наш бок граніцы прама ў возера Хасан.

Хоць абедзве сопкі і невысокія (Заазёрная мае ў вышыню каля паўтараста метраў), але ва ўмовах акружаючай роўнай мясцовасці ў яснае надворʻе з іх відаць усё наша ўзбярэжжа. Нашы пагранічнікі ва ўдачныя дні, калі рассейваюцца вельмі частыя тут туманы, у бінокль наглядаюць і бераг і дальнія астравы, раскіданыя ўздоўж узбярэжжа на шляху да Владзівастока.

Калі-б японцы ўтрымалі ў сваіх руках гэтыя вышыні, то іх умацаванні, наглядальныя пункты і агнявыя сродкі, размешчаныя на сопках, далі-б ім магчымасць трымаць пад наглядам і прамым агнём увесь участак нашай тэрыторыі на поўдзень і захад ад заліва Пасьет. А абгрунтуйся японцы на вышынях, яны непасрэдна пагражалі-б і нашай бухце Пасьет і ўзбярэжжу ў напрамку да Владзівастока.

Пачынаючы сваю авантуру, японская ваеншчына разлічвала на забяспечаны поспех. Яе супакойваў выключна цяжкі для нашай абароны характар мясцовасці, прылягаючай да возера Хасан. Адразу-ж за сопкамі Заазёрнай і Безымяннай, калі ісці ад граніцы ўглыб нашай тэрыторыі, ляжыць возера Хасан, выцягнутае на 4—5 кіламетраў з поўначы на поўдзень ўздоўж граніцы. Яго паўночны і паўднёвы краі знаходзяцца ад граніцы на адлегласці якіх-небудзь 150—200 метраў. Такім чынам, абедзве сопкі аддзелены ад астатняй совецкай тэрыторыі шырокай воднай перашкодай, абыйсці якую на шляху к сопкам можна толькі ў непасрэднай блізкасці ад граніцы па двух вельмі вузкіх праходах.

Кожнаму зразумела, якія вялікія перавагі гэта давала японскім войскам, нацэліўшымся на сопкі, і якія цяжкасці стварала для нас.

Японцы разлічвалі, несумненна, таксама і на тое, што балоцістая мясцовасць і абмежаваная колькасць дарог не дадуць нам магчымасці скарыстаць танкі і падвезці цяжкую артылерыю.

Як у выніку высветлілася, японцы загадзя рыхтаваліся да пагранічнага нападу. 19-я японская дывізія, размешчаная ў паўночнай, прыгранічнай, частцы Карэі, была мабілізавана і знаходзілася ў саставе ваеннага часу, у колькасці не менш 20 тысяч чалавек. К раёну нападу былі падцягнуты цяжкая, зенітная артылерыя і бронепаязды.

Японская ваеншчына прадукушала наперад поспех сваіх планаў, будуючы іх на ўліку вялікіх труднасцей, уставаўшых перад намі ў абароне совецкіх рубяжоў на подступах да Пасьета.

Але ў сваіх разліках японцы жорстка памыліліся. Чырвоная Армія, выпеставаная партыяй Леніна—Сталіна, выхаваная, як і ўвесь совецкі народ, на перамаганні любых труднасцей, яшчэ раз паказала ўсяму свету, што няма такіх крэпасцей, якія большэвікі не маглі-б узяць!

* * *

Застрэльшчыкамі нападу былі японскія пагранічныя атрады. Цёмнай і туманнай ноччу 28 ліпеня каля роты японскіх пагранічнікаў скрыта сканцэнтраваліся ў схілах сопак Заазёрная і Безымянная па свой бок граніцы. 29 ліпеня днём яны раптоўна атакавалі Безымянную. У гэты час на Безымяннай знаходзіўся наш пагранічны нарад у саставе адзінаццаці чалавек.

Не гледзячы на яўную перавагу сіл на баку японцаў, пагранічнікі сустрэлі нападаючых рашу-

чым адпорам. Завязаўся жорсткі бой, які перайшоў у рукапашную схватку. Пагранічнікі, адбіваючы наваліўшагася ворага штыкамі і прыкладамі, драліся да апошняй магчымасці. Пяць чалавек з састава нашых байцоў былі забіты, а астатнія ранены. Не маючы сіл больш утрымліваць вышыню, пагранічнікі былі вымушаны яе пакінуць.

Пачуўшы перастрэлку, да месца бою выступіў рэзерв пагранічнага атрада; штыковай атакай і гранатамі японцы былі адкінуты з Безымяннай. Яны адышлі за граніцу, пакінуўшы на нашым баку сваіх забітых.

З самага пачатку вылазка японцаў пацярпела няўдачу. Ім патрэбаваліся дадатковыя сілы і некаторы час на сканцэнтраванне. На наступны дзень—30 ліпеня каля возера Хасан было спакойна. На грэбнях сопак былі размешчаны нашы пагранічныя пасты.

31 ліпеня перад самым досвіткам, калі густы туман ахутваў мясцовасць да самых вяршынь сопак, японцы зрабілі новы напад. На гэты раз яны атакавалі абедзве вышыні—і Безымянную і Заазёрную. Цяпер з іх боку дзейнічалі ўжо не пагранічныя атрады, а палявыя войскі з вялікай колькасцю кулямётаў, мінамётаў і артылерыі. Як пасля было ўстаноўлена па забітых, японцы кінулі ў атаку два пяхотныя палкі 19-й дывізіі, падтрыманыя моцным артылерыйскім агнём.

Хлынуўшыя праз граніцу японскія войскі сутыкнуліся з нашымі пагранічнымі часцямі. Увесь дзень 31 ліпеня і 1 жніўня бой у раёне возера не спыняўся. Пагранічнікі паражалі японцаў агнём сваіх кулямётаў, штыкамі і ручнымі гранатамі. Нават будучы раненымі, байцы заставаліся ў страі, адмаўляючыся ад накіравання ў тыл і прадаўжаючы мужна драцца з ворагамі. Аднак перавага ў сілах была на баку японцаў; пракладваючы сабе дарогу цаной вялікіх страт, усцілаючы шлях забітымі і ранеными, японцы адцяснілі нашых пагранічнікаў і праніклі ўглыб совецкай тэрыторыі да 4 кілометраў.

З жыцця Чырвонай Арміі.
На здымку: ручныя кулямётчыкі Махідаў і Старавойтаў вядуць агонь па „працiўніку".

Захваціўшы Безымянную і Заазёрную, японцы пачалі іх паспешна ўмацоўваць, рабіць акопы і ствараць розныя перашкоды. Яны скарысталі камяністыя схілы сопак, размясцілі ўкрыта свае кулямёты і артылерыю, за асобнымі камнямі размясцілі снайпераў. Абедзве вышыні былі ператвораны ў аснову японскай абароны на возеры Хасан. Агонь кулямётаў з сопак і артылерыі, сканцэнтраванай за імі, запіраў адзіныя подступы да вышынь з поўначы і поўдня між граніцай і возерам.

Наша камандванне, сустрэўшыся з фактам уводу японцамі ў бой палявых войск, загадала палявым часцям Чырвонай Арміі выступіць на падтрымку пагранічнікаў і знішчыць захватчыкаў, якія нагла ўварваліся на совецкую тэрыторыю. Адначасова з гэтым найстражэй было загадана не пераходзіць граніцы.

Наш полк, які знаходзіўся ў адлегласці каля пераходу ад раёна баёў, атрымаў загад аб неадкладным выступленні. Галаўны батальён фарсіраваным маршам рушыўся да возера Хасан, за ім следвалі астатнія батальёны.

2 жніўня палявыя часці войск 1-й арміі, размешчаных у Пасьецкім раёне, уступілі ў бой з захватчыкамі. Быў туманны дзень, марасіў дождж. Праціўнік адкрыў ураганны артылерыйскі агонь. Аднак гэта не магло нас спыніць. Дружным націскам пагранічных часцей і палявых войск праціўнік быў адкінут за возера Хасан. Позна вечарам нашы войскі наблізіліся да занятых японцамі сопак Заазёрная і Безымянная.

Японцы знаходзіліся ў надзвычайна выгодных тактычных умовах. Перад іх пазіцыямі ляжала возера, якое не дазваляла нам атакаваць вышыні з фронта. Для таго, каб выгнаць ворага з совецкай зямлі, нам трэба было абыходзіць краі возера, гэта значыць рухацца ўздоўж самой граніцы, падаючы пад жорсткі агонь японскіх войск, якія знаходзіліся не толькі на вышынях Заазёрная і Безымянная, але і на іншых узвышшах, якія цягнуцца направа і налева ўздоўж граніцы.

Мы былі зацiснуты на вузкім прасторы паміж возерам і граніцай. Вядома, мы маглі-б значна хутчэй расправіцца з зарваўшымся ворагам, калі-б парушылі граніцу і авалодалі сопкамі, абыходзячы іх па манчжурскай тэрыторыі. Але нашы часці точна выконвалі загад камандавання і дзейнічалі ў межах сваёй тэрыторыі. У наступныя дні мы ўбачылі, наколькі гэта было цяжкім.

Наш батальён наступаў на японцаў праз паўднёвы подступ, маючы задачай заняць Заазёрную. Перад намі ляжаў прастор у паўтараста метраў, скрозь аплецены дротам і знаходзячыйся пад перакрыжаваным кулямётным агнём. Праз гэты лабірынт агню і дроту нам прадстаяла прабіцца і выкінуць захватчыкаў з совецкай зямлі. У такімжа становішчы знаходзіліся нашы часці, наступаўшыя праз паўночны подступ на Безымянную.

Усю ноч і ў наступныя дні мы адбівалі не спыняючыяся контратакі японцаў, штыкавымі ўдарамі адкідвалі ворага назад, на яго пазіцыі. Мы рухаліся наперад, б'ючыся літаральна за кожны крок: ні жорсткія контратакі японцаў, ні агонь кулямётаў, які не спыняўся ні на хвіліну, не маглі спыніць нашых байцоў. Павольна, але няўхільна мы набліжаліся да японскіх загародаў.

Байцы—далёкаўсходнікі, палкія патрыёты, не лічачыся ні з якімі труднасцямі, імкнуліся хутчэй выканаць пастаўленую камандаваннем задачу. Адна з рот папрасіла ў камандавання дазволу пранікнуць праз загароды і атакаваць японцаў. Добраахвотнікі, канкурыруючы адзін перад адным настойліва дабіваліся задаволення іх просьбы. Камандаванне дазволіла.

Пад прыкрыццём туману смельчакі расканцэнтраваліся на паўтараста метрах ляжачага наперадзе прастору і, перамагаючы дрот, падпаўзлі да японскіх умацаванняў. Калі туман рассеяўся, яны былі заўважаны японцамі, але паспелі за гэты час акапацца настолькі, што, як ні стараліся іх японцы выбіць, нічога не выходзіла.

За гэтыя дні наша камандаванне закончыла сканцэнтраванне тэхнічных сродкаў у колькасці, неабходнай для рашучага ўдару па захватчыках.

4 і 5 жніўня ішлі бесперапынныя дажджы. Дарогі размоклі, балоты ператварыліся ў азёры, што яшчэ больш ускладняла наша манеўраванне.

6 жніўня—дзень гадавіны Далёкаўсходняга Чырвонасцяжнага Фронта. З раніцы, як заўсёды, было туманна. Каля поўдня туман праясніўся. Раптам загудзела неба. Гэта ішлі нашы самалёты. Вось адзін дзесятак, другі, трэці, чацверты... іх было шмат. У баявым страі яны ішлі на праціўніка.

Падняліся ўверх слупы зямлі на бязлесных грэбнях занятых японцамі сопак, узляцелі абломкі японскіх гармат, шчэпкі зруйнаваных японскіх умацаванняў.

Як-бы спрачаючыся ў магутнасці з разрывамі авіябомб, загрукатала наша артылерыя. Яе снарады клаліся ў паласе японскіх пазіцый. Магутная артылерыйская падрыхтоўка злілася ў адно з авіябамбардыроўкай. Як відаць, не салодка адчувалі сябе японцы, атрымліваючы нашы гасцінцы!

Услед за бамбардыроўшчыкамі ўключыліся ў бой знішчальнікі. Кулямётным агнём яны паліваюць японскую пяхоту.

Прышла чарга для дзеянняў нашай пяхоты. У суправаджэнні танкаў яна рынулася ў атаку праз вузкі прастор. Японская артылерыя б'е па танках прамой наводкай. Танкі ныраючы ў няроўнасцях мясцовасці асцярожна выбіраюць вузкія палоскі праходзімага прастору, давяць дрот і ўрэзваюцца ў размяшчэнне японскіх пазіцый. Байцы разрываюць дрот нажніцамі, падрываюць яго ручнымі гранатамі. Нашы выдатныя байцы, пагарджаючы агнём японскай артылерыі, устаноўленай на манчжурскай тэрыторыі, упэўнена рухаюцца наперад; падраздзяленні спаборнічаюць адно з адным у тым, каб першымі ўвайсці з чырвонымі сцягамі на родную совецкую Заазёрную сопку.

К вечару самалёты паўтарылі атаку. Зноў гром разрываў, слупы зямлі. Артылерыйскі агонь японцаў паслаб, відаць некалькі японскіх батарэй былі падбіты нашай авіяцыяй і нашай артылерыяй.

Я не ўдзельнік імперыялістычнай вайны, але ведаю па апісаннях, якой сілы дасягаў агонь на фронце ў перыяд найбольш напружаных баёў. 6 жніўня і ў наступныя дні мы прарабілі тое, што рабілася ў тыя часы пры атацы вельмі ўмацаваных пазіцый і што ўвайшло ў гісторыю, як прыклады небывалага ўпорства і абароны і наступлення.

Спусцілася ноч. Бой не спыняўся, але японцы пачалі здаваць. Яшчэ націск, яшчэ раз брасок у атаку. З крыкамі: „Ура!", „Няхай жыве вялікі Сталін!" байцы імкнуцца ўверх па крутых схілах сопкі. Вораг не вытрымаў,—сопка наша! Заазёрная (Чанкуфын) зноў у нашых руках.

Досвіткам на Заазёрнай развяваліся чырвоныя сцягі.

Японцы паспелі грунтоўна ўмацавацца на вышыні. Яны пакінулі акопы глыбінёй у поўны профіль, убежышчы і бліндажы для пяхоты, грунтоўна разбураныя дзеяннямі нашай авіяцыі і артылерыі. Дротавыя загарожы перад японскімі пазіцыямі былі пабудаваны ў 3—4 рады колляў, уперадзе іх былі адкапаны процітанкавыя рвы. У пакінутых самураямі акопах мы знайшлі некалькі сот парожніх бутэлек з-пад спіртнога розных марак.

Японцы не хацелі паміраць з стратай вышыні. Азвярэлыя, з крыкам „банзай" яны карабкаліся па каменнях на сопку. Нашы байцы падпускалі іх на блізкую адлегласць, а затым закідвалі ручнымі гранатамі. Так адбіваліся неаднаразовыя контратакі японцаў. Большасць наступаўшых аставалася на месцы забітымі, а ўцалеўшыя скатваліся назад уніз.

У далейшыя дні асноўныя баі разгарнуліся на вышыні Безымянная, дзе японцы яшчэ займалі частку нашай тэрыторыі. Стараючыся выбіць японцаў, нашы часці мімаволі ўклініліся метраў на 300—400 у японскае размяшчэнне па той бок граніцы.

Японская артылерыя прадаўжала весці агонь, стараючыся падбіць нашы гарматы. Аднак агонь японцаў страдаў адным „дэфектам"—снарады траплялі куды ўгодна, толькі не ў цэль. Наша артылерыя ўпэўнена выконвала свае задачы, паражаючы непрыяцельскія гарматы. 8 жніўня па нашаму



З жыцця Чырвонай Арміі.
Байцы тт.Храпін і Лаўроў на прывале выпускаюць бюлетэнь.
Фото Захарава (СФ).



З жыцця Чырвонай Арміі. Байцы падраздзялення лейтэнанта тав. Зіміна ў разведцы. Фото Б. Фішмана (СФ)

батальёну адкрыла ўзмоцнены агонь адна з японскіх батарэй, перашкаджаючы нашаму наступленню. Пасля таго, як наша артылерыя накіравала агонь па гэтай батарэі, мы на сабе адчулі паспяховыя рэзультаты ў рабоце нашых артылерыстаў: спачатку японскі агонь аслаб, а затым спыніўся.

Баі за Безымянную багаты эпізодамі гераічных паводзін байцоў-патрыётаў. 9 жніўня група смельчакоў-добраахвотнікаў папрасіла ў камандавання дазволу знішчыць дзве японскія ўмацаваныя кропкі, якія ў асаблівасці перашкаджалі нашым дзеянням. Ноччу смельчакі падпаўзлі да ўмацаваных кропак, заклалі фугас і ўзарвалі адну з іх. Другую кропку яны прымусілі замаўчаць, ведучы бесперапынны агонь па амбразуры, адкуль да гэтага страляў японскі кулямёт.

Адно з нашых аддзяленняў, скрыта падышоўшы да размяшчэння праціўніка, сваім умелым агнём знішчыла японскі ўзвод.

На паўднёвым участку ў той-жа дзень, 9 жніўня, калі каля двух рот пяхоты праціўніка, пераправі ўшыся праз р. Тумень-Ула, збіраліся нас атакаваць, яны былі знішчаны: адна рота на месцы нашым артылерыйскім агнём, а другая—пры адступленні ўплаў праз раку. Выдатна дзейнічалі нашы сапёры, якія пад агнём японцаў будавалі ўмацаванні на адбітых намі вышынях.

Вялікімі намаганнямі перамагаючы труднасці мясцовасці і японскай абароны, нашы байцы, камандзіры і палітработнікі паслядоўна выконвалі волю совецкага народа, выказаную правадыром народаў таварышам Сталіным: „Ні аднаго вяршка сваёй зямлі не аддадзім нікому".

Мы не хочам ні карэйскай, ні манчжурскай зямлі, але раім вам, паны японцы, пакінуць надзеі на авалоданне нашымі сопкамі, азёрамі, пахацямі, гарадамі. Калі не хочаце зыйціся на гэтым па-добраму, мы вас пераканаем сілай, колькі-б войск вы ні сабралі і якіх-бы там гэта намаганняў ні каштавала. Такімі настроямі былі прасякнуты ўсе, хто ў тыя дні біўся з захватчыкамі. Вялікая сіла любві да радзімы, гарачае пачуццё совецкага патрыятызма кіравалі нашымі дзеяннямі ў гэтыя незабыўныя дні. З імем вялікага Сталіна на вуснах, пад чырвонымі сцягамі краіны соцыялізма мы ішлі ў бой і перамагалі. Гатоўнасць усёй неабсяжнай совецкай краіны адбіць налётчыкаў натхняла нас у цяжкіх умовах баявой работы.

Беспартыйныя чырвонаармейцы і камандзіры ў перыяд баёў масамі падавалі заявы аб прыняцці іх у партыю і комсамол. „Хочам ісці ў бой членамі партыі Леніна—Сталіна, членамі Ленінскага комсамола",—заяўлялі яны. У баі яны сваім беззаветным геройствам даказалі адданасць справе партыі і шчырасць свайго імкнення быць у яе радах. Зараз яны ўліліся ў нашу партыйную і комсамольскую сям'ю. Партыйныя і беспартыйныя большэвікі, змагаючыся плячом к плячу, перамаглі труднасці і вышвырнулі абнаглеўшых самураяў з роднай зямлі.

Да моманту перамір'я, якое было абвешчана 11 жніўня, на совецкай тэрыторыі не было больш ні аднаго японскага салдата. Японцы паспрабавалі было ў самы апошні момант высунуцца наперад на нашу тэрыторыю, накапляючыся за каменнямі сопкі Заазёрная. Яны скарысталі тое, што агонь з нашага боку быў спынен у сувязі з пачаўшымся перамір'ем. Аднак настойлівая пазіцыя нашага камандавання прымусіла японцаў паважаць заключанае пагадненне і адыйсці на лінію, якую яны займалі да перамір'я.

Зараз мы ўпэўнена трымаем у сваіх руках адваяваныя сопкі, палітыя крывёю сыноў соцыялістычнай радзімы, паўшых на абароне совецкіх граніц.

(„Правда")

Парады гаспадыням

Як засаліць агуркі

Для солкі лепш за ўсё браць агуркі тонкаскурыя, таму што агуркі з тоўстай скурай цяжка прапітваюцца соллю і лёгка закісаюць.

Старанна прамытыя і сартыраваныя агуркі ўкладваюць шчыльнымі радамі ў драўляны бачонак (лепш дубовы) у праслойку з наступнымі смакапрыправамі: ліст чорных парэчак, зелень укропу з цветам, чышчаны, рэзаны кружочкамі хрэн, чырвоны перац і раздзелены на долькі часнок. Калі бачонак запоўнен, зверху кладуць слой прыпраў і лісцяў. Затым заліваюць гатаваным, астыўшым расолам. Бачонак закалачваюць і захоўваюць у халодным памяшканні на працягу двух месяцаў да спажывання.

Ад няправільнасці пасола, прамярзання, ад частага адчынення бачонка і пранікнення туды паветра ўтвараецца закісанне, і ў агурках утвараецца пустата.

Прапорцыя: на 1 літр вады 60—70 грамаў солі, 20 грамаў ліста парэчак, 20 грамаў укропу, 2 грамы перца, 2 грамы часнака і 3 грамы чышчанага хрэну.

Як засаліць памідоры

Можна саліць спелыя, не зусім зрэлыя і нават зялёныя памідоры, але кожны сорт саліць трэба асобна.

Памідоры трэба перабраць, адкінуць папсаваныя і разбітыя, прамыць і ўкласці ў кадку радамі. На дно кадкі насыпаць іржаной мукі ў поўсантыметра таўшчынёй. Кожны рад перакласці: укропам, чырвоным перцам, долькамі чэснака і чышчаным, рэзаным кружочкамі хрэнам і заліць гатаваным, астыўшым расолам.

На кадачку трэба палажыць кружок, прыціснуць і захоўваць у прахладным месцы.

З прычыны таго, што салёныя памідоры хутчэй псуюцца, чым агуркі, іх трэба расходваць хутчэй.

Працягласць засола спелых памідор—адзін месяц, няспелых—паўтара месяца, зялёных—два месяцы.

Прапорцыя: на 1 літр вады на спелыя памідоры—40 грамаў солі, не зусім спелыя—50 грамаў і на зялёныя—60—70 грамаў, 30 грамаў укропу, 3 грамы чырвонага перца, 2 грамы чэснаку і 2 грамы хрэну.

Як саліць грыбы

Саліць можна ўсе годныя для яды грыбы і, наогул, не трэба саліць усялякую пароду грыбоў асобна, але рыжыкі і груздзі лепш саліць асобна. Грыбы трэба добра вымыць, абрэзаць карашкі і апусціць у кіпячую, пасоленую ваду, давесці да першага кіпення, зліць ваду, даць астыць, пасля чаго класці ў сухую вышпараную кадачку, на дно якой пасыпаць крыху солі. Укладваць грыбы трэба радамі, шляпкамі кверху, перасыпаючы кожны рад соллю і перакладваючы смакапрыправамі. Калі кадачка будзе поўна, трэба зверху залажыць чыстую анучку, змочаную ў салёнай, пракіпячонай вадзе. Затым кладуць кружок і прыціскаюць; бачонак выносяць у прахладнае месца. Час ад часу чыстую анучку трэба мяняць. Калі грыбы зверху трохі заплеснявеюць, то гэтыя грыбы трэба зняць і краі кадачкі абмыць гатаванай халоднай салёнай вадой. Працягласць засола 10—20 дзён.

Прапорцыя: на 1 кілограм чышчаных грыбоў—400 грамаў солі, 10 грамаў ліста чорных парэчак, 20 грамаў укропу, 2 грамы чырвонага перцу.

Як марынаваць грыбы

Адзін кілограм грыбоў старанна ачышчаюць ад мусара, аддзяляюць шляпкі ад карашка. Карашкі рэкамендуецца разрэзаць. Пасля гэтага грыбы прамываюць і кладуць на поўгадзіны ў салёную ваду.

Марынад робяць наступным чынам: бяруць поўлітра вады, 100 грамаў воцату, 50 грамаў цукру, солі па смаку, 2 грамы гваздзікі, 2 грамы лаўровага ліста і душыстага перцу, 200 грамаў раслінага масла. Усё гэта трэба ўскіпяціць і ў гарачы марынад апусціць вымытыя і вымачаныя грыбы.

Кіпяціць грыбы ў марынадзе трэба 20 мінут. Пасля гэтага зняць з пліты і ахаладзіць. Астыўшыя грыбы трэба палажыць у банку і добра закупорыць.

Адказны рэдактар Г. В. КАГАН.

Адрас рэдакцыі: Менск, Дом Працы, 3-ці паверх, пакой 8. Тэл. 24-058, 24-070.

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 3854. Тыраж 9.000 экз. Уп. Галоўліта БССР № 916.

Здана ў друкарню 7/IX—38 г. Падпісана да друку 19/IX—38 г. У нумары 2½ арк. 120.140 друк. знакаў

Цана 20 кап.

081

Беларская Кніжная Палата
АРХІУ ДРУКУ БССР
938